# ВЫТОКІ БЕЛАРУСКАЙ ХРЫСЦІАНСКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

Багдановіч А.Г.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

Адной з першых легальных палітычных арганізацый у Беларусі ў пачатку ХХ ст. была Канстытуцыйна-каталіцкая партыя Літвы і Беларусі, створаная ў канцы 1905-пачатку 1906 гг. віленскім каталіцкім епіскапам Э. Ропам. Менавіта яна паклала пачатак арганізацыйнаму афармленню беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху. Ідэалогія Канстытуцыйна-каталіцкай партыі Літвы і Беларусі спалучала лібералізм кадэцкага накірунку ў адносінах да палітычнага жыцця, кансерватызм у падыходах да сацыяльна-эканамічных праблем Беларусі і Літвы і ідэалы хрысціянскай дэмакратыі.

Так, праграмныя палажэнні ККП ЛіБ прадугледжвалі рэфармаванне дзяржаўнага ладу Расіі – пераўтварэнне яе ў прававую дзяржаву з вяршэнствам закона ва ўсіх сферах жыцця грамадства. Пры гэтым у праграме ККП ЛіБ неаднаразова падкрэслівалася, што Расійская дзяржава павінна як мага шырэй развіваць мясцовае самакіраванне, у тым ліку і краёвую аўтаномію Беларусі і Літвы [1].

Беларускі хрысціянска-дэмакратычны рух пачатку ХХ ст. знайшоў свой лагічны працяг у заснаванні так званай Хрысціянска-дэмакратычнай злучнасці беларусаў – клерыкальнай нацыянальнай партыі, што ўзнікла ў маі 1917 г. у Петраградзе. Заснавальнікамі і галоўнымі ідэолагамі партыі былі беларускія ксяндзы Абрантовіч Ф., Хвецка Л., Станкевіч А., Гадлеўскі В., Будзька Ф., Зязюля А. (Астрамовіч А.С.), Сваяк К. (Стаповіч К.) і інш. Друкаваны орган – газета “Беларуская крыніца”.

24-25 мая 1917 г. Злучнасць правяла ў Мінску з’езд беларускага каталіцкага духавенства. У прынятай на з’ездзе рэзалюцыі вылучаліся патрабаванні шырокай аўтаноміі Беларусі ў Расійскай Федэратыўнай Дэмакратычнай рэспубліцы, навучання ў школах на беларускай мове, паступовага пераходу на беларускую мову ў богаслужэнні [7, с. 87]. На гэтым з’ездзе пастанавілі выдаваць у Пецярбурзе беларускія кнігі для школ і беларускую газету

“Бацькаўшчына”. Пазней аднак назва была зменена і замест “Бацькаўшчыны” стала выходзіць “Беларуская крыніца”.

Беларускія хрысціянскія дэмакраты (хадэкі) не прымалі актыўнага ўдзелу ў Першым Усебеларускім з’ездзе (снежань 1917 г., Мінск). У выканаўчы камітэт Савета з’езду ніхто з сяброў БХДЗ не ўвайшоў. Не былі прадстаўлены хадэкі і ў першым беларускім нацыянальным урадзе – Народным сакратарыяце.

Сябры ХДЗБ увайшлі ў склад Мінскага Беларускага прадстаўніцтва – палітычнага аб’яднання, створанага 25 лютага 1918 г. з прадстаўнікоў Беларускай народной партыі сацыялістаў, Партыі сацыялістаў-аўтанамістаў, Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, Беларускага праваслаўнага аб’яднання, Беларускага саюза зямельных уласнікаў і інш. У праграмным дакуменце аб’яднанне заявіла, што “прадстаўляе інтарэсы беларускага народа і з’яўляецца палітычным цэнтрам”, які абараняе незалежнасць Беларусі, культуру і самабытнасць беларускага народа [8, с. 115].

Увогуле, на першым этапе сваёй дзейнасці (1917–1918 гг.) сябрамі Злучнасці былі амаль выключна каталікі. Што ж датычыцца палітычных поглядаў ХДЗБ, то яна, як і пераважная большасць тагачасных беларускіх нацыянальных партый, аб незалежнасці яшчэ не гаварыла, а толькі аб аўтаномнай Беларусі ў межах Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай рэспублікі. Пры гэтым першасная ўвага надавалася культурна-асветніцкай працы сярод каталіцкага насельніцтва Беларусі. Актыўная палітычная дзейнасць не была вызначальнай для беларускай хрысціянскай дэмакратыі ў гэты пераломны час.

24 жніўня 1919 г. выйшаў першы нумар “Беларускай крыніцы” у Вільні. З гэтага часу менавіта Вільня становіцца цэнтрам дзейнасці беларускіх хадэкаў. 14–16 лютага 1918 г. у Петраградзе прайшоў З’езд беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў. У верасні гэтага ж года ў Мінску адбыўся сход беларускіх хадэкаў. Менавіта на гэтых двух форумах і былі абмеркаваны і прыняты асноўныя палажэнні Статута і Праграмы ХДЗБ. Асобнай брашурай Статут і Праграма партыі былі выдадзены ў 1920 г. у Мінску [3]. Статут, перш за ўсё, вызначыў назву партыі – “Хрысціянская дэмакратычная злучнасць беларусаў”, па-другое, абвясціў асноўную мэту ХДЗБ – “зарганізаванне ўсіх тых, хто хоча жыць, апіраючыся на сацыяльную справядлівасць і хрысціянскую міласць, паводле асноў

хрысціянскага светапогляду” [3, с. 1]. У адпаведнасці са Статутам вышэйшым органам партыі з’яўляўся Галоўны ўрад ў складзе 10 сяброў Злучнасці і 1 патрона – каталіцкага ксяндза. Сябрам Злучнасці мог стаць “кожны хрысціянін, каторы прызнае ўставу Злучнасці і стараецца гэтую ўставу ўвесці ў жыццё” [3, с. 3]. 20 і больш сяброў Злучнасці маглі заснаваць гурток. У прэамбуле Праграмы ішла гутарка пра ідэалагічныя і арганізацыйныя вытокі ХДЗБ, падкрэслівалася яе сувязь з агульнаеўрапейскім хрысціянска-дэмакратычным рухам, з хрысціянска-дэмакратычнымі арганізацыямі ў Польшчы і Расіі.

У першым пункце Праграмы ХДЗБ ахарактарызавала сябе як арганізацыю грамадскую, “эвалюцыйную, надпалітычную, міжнародную”, што хоча завесці на свеце “лад на аснове хрысціянскай і дэмакратычнай справядлівасці, роўнасці, міласці і свабоды” [3, с. 9]. У гэтым жа раздзеле вызначалася палітычнае крэда хрысціянскіх дэмакратаў —змаганне з капіталізмам, як адной з найважнейшых прычын беднасці і галечы працоўных мас і ўсталяванне такога ладу, “каб кожнаму чалавеку магчыма было сваею працаю здабыць сабе неабходнае і карыстаць з усяго культурнага багацця”. Падкрэслівалася, што хрысціянскія дэмакраты супраць усякіх прывілеяў класавых [3, с. 9].

Што тычыцца нацыянальнай праграмы беларускіх хадэкаў, то яна ўключала ў сябе “прызнанне права існавання, развіцця і кіравання сабой хоць бы найменшага народу кожнага…. У адносінах да малых народаў, як Літва, Латвія, Беларусь, Украіна, трэба стаяць на грунце поўнага іх самаазначэння” [3, с. 9–10]. ХДЗБ, як партыя клерыкальная, прызнала рэлігію як “найважнейшую падставу існавання людскога, без каторай няпоўным і неспакойным было б жыццё як аднага чалавека, так і ўсіх народаў”. Пры гэтым для Беларусі вылучалася асобнае патрабаванне: “зблізіць усіх католікаў і праваслаўных і аб’яднаць іх ў адной веры з рознымі абрадамі” [3, с. 10–11].

Значнае месца ў Праграме адводзілася пытанням развіцця сям’і і школы. Мэтай абвяшчалася “ўмацаванне сям’і хрысціянскай”. Пры гэтым для хадэкаў прадстаўлялася бясспрэчнай цесная сувязь паміж сям’ёй і школай. Адсюль ставілася задача: “ўвясці навучанне пачатковае ў роднай мове; увясці навуку рэлігіі каталіцкай ва ўсе школы ўрадавыя і прыватныя ў роднай мове моладзі…” [3, с. 11].

Эканамічная праграма Злучнасці не выходзіла за рамкі еўрапейскага лібералізму. ХДЗБ прызнала прыватную ўласнасць "падставай цывілізацыйнага поступу грамадзянства." Таму хрысціянскія дэмакраты былі прынцыпова супраць адмены прыватнай уласнасці. У той жа час яны не адмаўлялі магчымасці паступовага развіцця калектыўных форм уласнасці [3, с. 12]. У справе зямельнай патрабаванні Злучнасці зводзіліся да наступнага:

"1. Каб была падзелена казённая зямля паміж беззямельнымі і малазямельнымі з мэтай стварэння малой уласнасці;

2. Агранічыць вялікую ўласнасць прыватную, аблажыўшы яе вялікімі падаткамі;

3. Падняць культуру зямельную дапамогамі ўраду…" [3, с. 13].

Што датычыцца сродкаў вырашэння эканамічных пытанняў на Беларусі, то адзіным магчымым прызнаваўся шлях паслядоўных рэформ. Пэўнае месца ў праграме занялі пытанні працоўнага заканадаўства, паколькі для хадэкаў праца была "найважнейшай падставай жыцця людскога і поступу яго, як матэрыяльнага, так і духоўнага" [3, с. 13].

У галіне абароны праў працоўнага народа галоўныя праграмныя патрабаванні ХДЗБ зводзіліся да наступных мер: заснаванне міністэрства працы, устанаўленне мінімума зарплаты, роўнасць у аплаце працы для мужчын і жанчын, адпачынак па нядзелях і святочных днях, забарону працы дзяцей да 14 год, абавязковыя выплаты дапамогі хворым работнікам, а таксама цяжарным жанчынам, дапамога беспрацоўным, інвалідам і пажылым людзям [3, с. 14].

У галіне нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва беларускія дэмакраты дамагаліся роўнасці ўсіх народаў, свабоднага развіцця нацыянальных моў, роўнасці ўсіх грамадзян перад законам, усеагульнага выбарчага права, развіцця мясцовага самакіравання.

"Кожны народ мае права свабодна развіваць форму жыцця свайго народнага і патрыятычнага. Х.Д. мае перакананне, што не народ для гаспадарства, але гаспадарства патрэбна для пажытку і бяспечнага жыцця народу". Што датычыцца Беларусі, то "ХДЗБ жадае, каб яна была цэлай, непадзельнай і вольнай. Каб на Беларусі была роўнасць і свабода грамадзянская і запэўнены правы народных меншасцяў. Каб сойм вольнай Беларусі, каторы будзе выдаваць правы, быў выбраны на аснове справядлівага, паўсюднага

галасавання і каб толькі ён меў права сказаць слова аб урадзе і яго форме на Беларусі і аб адносінах да другіх гаспадарств …” [3, с. 15].

Як бачым, у сваёй першай праграме беларускія хрысціянскія дэмакраты пакуль яшчэ не вылучаюць патрабаванне незалежнасці Беларусі і не ўдакладняюць форму нацыянальна-дзяржаўнага ўладкавання края.

1 ліпеня 1921 г. у Вільні быў зацверджаны Статут Таварыства Беларускай школы (ТБШ) – масавай культурна-асветніцкай арганізацыі Заходняй Беларусі, галоўнай мэтай якой было “распаўсюджваць і дапамагаць асвеце сярод беларусаў, пашыраць беларускія школы і беларускую асвету наогул” [5, с. 489]. У першыя гады сваёй дзейнасці (1921–1926 гг.) ТБШ існавала толькі на Віленшчыне. Менавіта ў гэты час значны ўплыў на яе стратэгію і тактыку аказвалі беларускія хрысціянскія дэмакраты. У 1924–1926 гг. ТБШ узначальваў лідэр БХДЗ Станкевіч А. Пад уплывам сяброў ХДЗБ Таварыства пазбягала палітычных метадаў і сродкаў змагання, было прыхільным амаль выключна асветніцтву.

Прадстаўнікі БХД актыўна працавалі таксама ў складзе Беларускага нацыянальнага камітэту (БНК) – каардынацыйнага прадстаўнічага органа беларускіх нацыянальна-дэмакратычных партый і арганізацый, створанага ў Вільні ў 1921 г. БНК ставіў сабе мэту стварыць Беларуска-Літоўскую дэмакратычную рэспубліку, напачатку дамагаючыся культурна-нацыянальнай аўтаноміі Заходняй Беларусі, вёў культурна-асветніцкую і кааператыўную работу.

Беларускія хрысціянскія дэмакраты прымалі ўдзел у фарміраванні Беларускага цэнтральнага выбарчага камітэта (БЦВК) – каардынацыйнага органа беларускіх палітычных арганізацый у Заходняй Беларусі, створанага ў канцы жніўня 1922 г. У склад камітэту ўваходзілі 12 сяброў БХД.

Пашырэнне ўплыву БСРГ на заходнебеларускае працоўнае грамадства, распаўсюджванне марксісцкіх ідэй, узмацненне сацыяльнага радыкалізму ў грамадска-палітычным руху прымусілі беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў перагледзець сваю стратэгію і тактыку. І калі ў першыя гады свайго існавання ХДЗБ праводзіла працу выключна ў каталіцкім духу і перш за ўсё сярод беларускага каталіцкага насельніцтва, то зараз усё больш увагі надаецца папулярызацыі ідэй хрысціянскага дэмакратызму сярод праваслаўнага сялянства Заходняй Беларусі.

Ідэалагічныя пошукі ХДЗБ знаходзілі адлюстраванне на старонках яе друкаванага органа – газеты “Беларуская крыніца”. У 25 і 26 нумарах “Беларускай крыніцы” за 1926 г. былі надрукаваны праекты адноўленай Праграмы ХДЗБ і яе Статута. 6 лістапада 1927 г. адбыўся З’езд прадстаўнікоў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі. Удзельнічалі 129 сяброў БХД і каля 50 гасцей. Старшынёй з’езда быў аднагалосна абраны Станкевіч А., які выступіў з дакладам на тэму “БХД і яе ідэалогія” [4, с. 1]. На з’ездзе разгарнулася дыскусія пры абмеркаванні Праграмы і Статута партыі.

Перш за ўсё была зменена назва партыі – замест слоў “Хрысціянская дэмакратычная злучнасць беларусаў” зацвердзілі назву “Беларуская хрысціянская дэмакратыя”. Першы параграф праграмы ўдакладніў галоўную палітычную мэту партыі – “самастойнасць беларускага народу на ўсіх яго землях, аб’яднаных у незалежную дэмакратычную рэспубліку” [2, с. 184]. Адзначым тут два істотных адрозненняў ад Праграмы партыі 1920 г. – адмова ад прынцыпу “надпалітычнасці” і прызнанне незалежнасці Беларусі як галоўнай мэты.

Па меркаванню Станкевіча, палітычны незалежніцкі ідэал БХД быў простай і лагічнай высновай з акту 25 сакавіка 1918 г. У той жа час партыя беларускіх хрысціянскіх дэмакратаў трымалася ідэі незалежнай беларускай рэспублікі ў яе этнаграфічных межах толькі ў самых агульных абрысах. Унутраны сацыяльны лад рэспублікі, яе узаемаадносіны з суседзямі – гэтыя і іншыя практычныя пытанні пакідаліся на вырашэнне ў перспектыве “у адпаведнасці з духам часу і зыходзячы з патрэб беларускага народа” [2, с. 230].

Істотныя змены былі ўнесены ў параграф 35 Праграмы БХД – аб працоўнай норме на зямлю і дапушчэнні 1-2-х наймітаў. У выніку галасавання дэлегаты з’езда дапоўнілі гэты параграф палажэннем аб тым, што найміты дапускаюцца толькі ў тым выпадку, калі сялянская сям’я “не мае даволі сваіх сілаў дзеля апрацавання рабочай нормы, напрыклад, на выпадак хваробы асоб і сям’і, старасці і калецтва і т.п.” [4, с. 1].

Адносна Статуту ўдзельнікі з’езда пастанавілі змяніць пункт аб ліку сяброў ЦК БХД, замест 7 асоб іх лік павялічыўся да 9 членаў ЦК БХД і 2 намеснікаў. З’езд прыняў таксама шэраг рэзалюцый па важнейшых пытаннях, сярод якіх вызначым наступныя:

1. “Аб рэлігійным жыцці” (супраць скасавання беларускай мовы; за ўвядзенне набажэнства на беларускай мове ва ўсіх царквах на землях з беларускім насельніцтвам; за выдзяленне ў Вільні асобнага касцёлу для беларусаў-каталікоў);

2. “Асвета” (адкрыццё ўрадавых школ за дзяржаўны кошт у ліку, прапарцыянальным да ўсяго беларускага насельніцтва);

3. “Гаспадарка” (дамагацца ад ураду грашовых крэдытаў для Беларускага Інстытута гаспадаркі і культуры);

4. “Палітыка” (маючы на ўвазе будучыя ў хуткім часе выбары ў Сойм і Сенат, імкнуцца да стварэння агульнабеларускага фронту) [4, с. 1].

Наступны з’езд БХД адбыўся ў Вільні 25 лістапада 1928 г. У ім прынялі ўдзел 72 сябры БХД і 31 госць [2, с. 181]. На гэтым з’ездзе выступіў пасол Стэповіч А. з аглядам Праграмы і Статуту партыі. Былі ўнесены пэўныя змены неістотнага зместу.

Наступны, апошні з’езд БХД адбыўся 13 снежня 1931 г. таксама ў Вільні. Па звестках Станкевіча А., у рабоце з’езда прынялі ўдзел 101 сябар БХД (як каталіцкага, так і праваслаўнага веравызнання) і 24 госці. З’езд абмеркаваў праграму і статут партыі і ўнёс пэўныя карэктывы [2, с. 182].

Надрукаваная ў 1932 г. 4-я праграма БХД, у адрозненне ад папярэдніх, не дапускала магчымасці аддзялення касцёла (царквы) ад дзяржавы. У ёй падкрэслівалася, што “БХД прынцыпова супраць аддзялення касцёла (царквы) ад дзяржавы і змагаецца з палітыкай, што выкарыстоўвае рэлігію для палітычных мэтаў, або падтрымлівае адну рэлігію супраць другой”. У Праграме адзначалася таксама абавязковасць вывучэнне рэлігіі як у дзяржаўных, так і ў прыватных школах.

У Праграме БХД 1932 г. больш увагі надавалася сацыяльна-эканамічным пытанням. Так, 34 параграф праграмы быў дапоўнены палажэннем аб тым, што “ўсе землі, перавышаючыя працоўную норму, перадаюцца ва ўласнасць і без выкупу беззямельным і малазямельным сялянам”. Раздзел “Праца” дапоўнены патрабаваннямі 8-гадзіннага рабочага дня, права на забастоўку, стварэння рабочых камітэтаў з правам нагляду за вытворчасцю і прыбыткамі і іншае, чаго не было ў папярэдніх праграмах [6, с. 418].

Такім чынам, заснавальнікі беларускага хрысціянска-дэмакратычнага руху адстойвалі асновы дэмакратычнага ладу, выступалі за эвалюцыйны шлях развіцця грамадства, легальныя формы барацьбы, адмоўна ставіліся да сацыялістычнай рэвалюцыі. Як прыхільнікі незалежніцкіх ідэалаў, беларускія хадэкі прытрымліваліся тэорыі самабытнасці развіцця беларускай нацыі і абуджалі нацыянальную свядомасць беларусаў на аснове хрысціянскай этыкі і дэмакратычных прынцыпаў. Сябры ХДЗБ-БХД выступалі супраць сацыяльна-класавага падыходу ў дзейнасці Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі, рэвалюцыйнага характару Беларускай сялянска-работніцкай грамады, згодніцтва паланафільскіх груповак. Яны асуджалі тэрор і ганенні заходнебеларускага насельніцтва з боку польскіх улад, з самага пачатку сваёй дзейнасці былі прыхільнікамі беларусізацыі касцёла (царквы).

У праграмных дакументах ХДЗБ-БХД шмат было супярэчлівага, ідэалістычнага з улікам умоў тагачаснай Беларусі. Па сутнасці, Беларуская хрысціянская дэмакратыя не сумела знайсці шырокую падтрымку сярод працоўнага насельніцтва Заходняй Беларусі, асабліва праваслаўнага веравызнання, не стала масавай палітычнай партыяй. Яе памкненні да лідэрства ў беларускім нацыянальна-вызваленчым руху засталіся нерэалізаванымі.

**Выкарыстаная літаратура**


1. Program Stronnictwa Konstytucyino-Katolickiego na Litwe I Bialorus. – Wilno, 1906.
2. Stankievic, Ad. Bielaruski Chryscianski ruch (Histarucny narys). – Vilnia: Vydannie “Chryscianskaj Dumki”, 1939. – 272 s.
3. Ustawa I pragrama Chryscijanskaj Demakratycznaj Zlucznasci Bielarusau. – Miensk: Drukarnia Wajskowaja, 1920. – 17 s.
4. Беларуская крыніца. – 1927. – 18 лістапада. – № 47.
5. Вабішчэвіч, Аляксандр. Таварыства Беларускай школы. / Аляксандр Вабішчэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск.: БелЭн, 2001 – Т. 6. Кн. 1.– С. 489-490.
6. Ладысеў, У.Ф. Беларуская хрысціянская дэмакратыя. / У.Ф. Ладысеў // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Мінск: БелЭн, 1993. – Т. 1. – С. 417–419.

7. Станкевіч, А. Да гісторыі беларускага палітычнага вызвалення / А. Станкевіч. – Вільня: Шлях моладзі, 1935 – 128 с.
8. Сташкевіч, М.С. “Менскае Беларускае прадстаўніцтва”. / М.С. Сташкевіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т.. – Мінск: БелЭн, 1999. – Т. 5. – С. 115.

## МАСОНСКІЯ ЛОЖЫ НА БЕЛАРУСКА-ЛІТОЎСКІХ ЗЕМЛЯХ У ХІХ – ПАЧАТКУ ХХ стст.

Багалейша С.В.,
кандыдат гістарычных навук, дацэнт

У беларускай гістарычнай навуцы шмат якія сюжэты гісторыі Беларусі разглядаліся павярхоўна і аднабакова ці, наогул, не разглядаліся. Адным з такіх пытанняў з’яўляецца дзейнасць масонскіх арганізацый ХІХ – пачатку ХХ стст. на тэрыторыі Беларусі, Літвы і іх роля ў развіцці нацыянальнай ідэі, руху і нацыянальным адраджэнні. Гісторыя масонскіх ложаў пакуль рэдка была аб’ектам увагі беларускіх даследчыкаў. Няма ніякіх падстаў сцвярджаць, што ў тыя ці іншыя перыяды нашага мінулага масоны адыгрывалі значную ролю. Але прыцягвае ўвагу сам факт існавання таямнічых ложаў. Масонскія арганізацыі ў ХІХ–ХХ стст. адыгрывалі значную ролю ў грамадска-палітычным і культурным жыцці Еўропы і Новага Свету. Акутаныя таямніцамі і міфамі, масонскія ложы часцей за ўсё выконвалі функцыі дваранскіх клубаў, месцаў, дзе абмяркоўваліся і выспявалі палітычныя ідэі.

Трэба адзначыць, што непасрэднае дачыненне да віленскага масонства мелі вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху Антон і Іван Луцкевічы, Вацлаў Ластоўскі, Іван Краскоўскі і інш. Шматлікія кантакты паміж беларускімі, літоўскімі і яўрэйскімі дэмакратамі Віленшчыны адбываліся на паседжаннях масонскіх ложаў. У масонскіх арганізацыях былі прадстаўлены ўсе асноўныя палітычныя плыні краю, незалежна ад іх нацыянальнай арыентацыі. Масонства прадстаўляла сабою форму самаарганізацыі эліты грамадства.

Культ навукі, розуму і асветы стварыў вакол масонскіх ложаў арэал вольнадумства і таму яны трапілі пад праследаванне